# *§ 3–0. Рэвалюцыі і нацыянальныя рухі ў свеце

**РЭВАЛЮЦЫЯ**
**КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ МАНАРХІЯ**
**БУРЖУАЗІЯ КРЭОЛЫ**
**АБСАЛЮТЫЗМ ІМПЕРЫЯ**
**НАПАЛЕОНАЎСКІЯ ВОЙНЫ**
**АСВЕТНІЦТВА**
**ПАРЛАМЕНТ СВЯШЧЭННЫ САЮЗ**

Фарміраванне ідэалогіі нацыяналізму

**1. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і ідэалогіі нацыяналізму.** Французская рэвалюцыя канца XVIII ст. і Напалеонаўскія войны далі штуршок да фарміравання нацыянальнай самасвядомасці народаў Еўропы і ідэалогіі нацыяналізму. Сутнасць яе палягае ў тым, што свая нацыя лічыцца найважнейшай каштоўнасцю. Нацыяналізм стварае станоўчы вобраз сваёй нацыі, паказвае яе слаўную мінуўшчыну, прагназуе паспяховую будучыню. Ад часоў Французскай рэвалюцыі атрымала пашырэнне ідэя, згодна з якой нацыя з'яўляецца адзінай крыніцай улады ў створанай ёю дзяржаве.

Рост нацыянальнай самасвядомасці

Падчас Напалеонаўскіх войнаў у шэрагу еўрапейскіх дзяржаў сфарміраваўся магутны рух супраць французскага панавання. Прыкладам могуць выступіць народная вайна супраць заваёўнікаў у Іспаніі, антыфранцузскія паўстанні ў германскіх дзяржавах у 1813 г. Удзельнікі гэтых рухаў імкнуліся да стварэння незалежных дзяржаў, у якіх нацыі як народу, надзеленаму палітычнымі правамі, належала б галоўная роля ў кіраванні дзяржавай.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З працы Э. Хабсбаума «Нацыі і нацыяналізм пасля 1780 г.»**

На практыцы ж існавала толькі тры крытэрыі, якія дазвалялі з пэўнасцю прылічыць дадзены народ да «нацый». Першы крытэрый — гістарычная сувязь народа з сучаснай дзяржавай або з дзяржавай, што мела даволі працяглае і нядаўняе існаванне ў мінулым…

Другім крытэрыем было існаванне даўно і трывала ўкаранёнай культурнай эліты, якая валодала пісьмовай нацыянальнай мовай — літаратурнай і адміністрацыйнай…

Трэцім крытэрыем — на жаль, даводзіцца сказаць і пра гэта — з'яўлялася ўжо доказаная на практыцы здольнасць да заваёў. Быць імперскім народам — вось што лепш за ўсё астатняе прымушае насельніцтва ўсведамляць сваю калектыўную еднасць як такую. Апроч таго, заваёвы ўяўлялі сабой для XIX ст. доказ паспяховай эвалюцыі дадзенага сацыяльнага віду.

1. *Якое значэнне ўкладвалі ў паняцце «нацыя» ў XIX ст.? Прывядзіце прыклады «нацый» XIX ст., якія адпавядалі гэтым крытэрыям.*
2. *Чаму адным з крытэрыяў нацыі з'яўляецца яе здольнасць да заваёў? Які ўплыў гэта аказвала на знешнюю палітыку еўрапейскіх дзяржаў?*
3. *Ці актуальныя гэтыя крытэрыі на цяперашні час?*

З ростам нацыянальнай самасвядомасці народаў Еўропы ўступілі ў супярэчнасць рашэнні, прынятыя на Венскім кангрэсе ў 1814–1815 гг. Манархі, што сабраліся ў сталіцы Аўстрыі, вызначалі новыя еўрапейскія межы і не лічыліся пры гэтым з інтарэсамі народаў. Многія этнасы былі пазбаўлены магчымасці ствараць свае дзяржавы і апынуліся ў складзе шматнацыянальных імперый. Немцам і італьянцам было адмоўлена ў стварэнні адзінай нацыянальнай дзяржавы. Такія дзяржавы, як Францыя, Іспанія, былі нацыянальнымі, але ў іх крыніцай улады манархаў у 1814–1815 гг. лічылася «боскае права», а не нацыя, як таго патрабавала ідэалогія нацыяналізму. З названых прычын нацыяналізм, нацыянальныя рухі апынуліся сярод праціўнікаў міжнародных адносін і палітычных

парадкаў у дзяржавах Еўропы, усталяваных пасля Напалеонаўскіх войнаў.

Уплыў нацыяналізму на рэвалюцыйныя падзеі

Уплыў нацыяналізму выразна прасочваецца ў рэвалюцыях, якія перажыла Еўропа ў першай палове XIX ст. Напачатку 1820-х гг. у Грэцыі разгарнулася барацьба супраць асманскага панавання за стварэнне нацыянальнай незалежнай дзяржавы, што завяршылася перамогай. Але ж рэвалюцыйныя выступленні ў італьянскіх дзяржавах у гэты ж час, якія мелі мэтай ліквідацыю аўстрыйскага панавання і аб'яднанне краіны, скончыліся паражэннем. Буйны́м поспехам нацыянальных памкненняў еўрапейскіх народаў у барацьбе супраць усталяваных Венскім кангрэсам парадкаў сталі перамога Бельгійскай рэвалюцыі 1830 г. і стварэнне незалежнай Бельгіі. Нацыянальнае пытанне ў многіх краінах адыгрывала важную ролю падчас еўрапейскіх рэвалюцый 1848–1849 гг. У Германіі і Італіі была здзейснена спроба стварыць адзіныя нацыянальныя дзяржавы. Яна скончылася няўдала. Аўстрыйская імперыя сутыкнулася з магутнымі нацыянальнымі рухамі народаў, што ўваходзілі ў яе склад (венграў, чэхаў, італьянцаў), якія намагаліся здабыць незалежнасць. Аднак гэтая шматнацыянальная імперыя ў той момант здолела ўстояць.

Нацыяналізм і лібералізм

Падчас еўрапейскіх рэвалюцый першай паловы XIX ст. нацыяналізм аказаўся шчыльна знітаваны з такой палітычнай плынню, як лібералізм. Лібералы адстойвалі права народаў на стварэнне нацыянальных суверэнных дзяржаў, ролю нацыі як грамадскага інстытута, ад якога паходзіць усякая ўлада ў гэтай дзяржаве.

**2. Рэвалюцыі і нацыянальныя рухі 1820-х гг.**

Перадумовы рэвалюцыйных падзей 1820-х гг.

У еўрапейскіх краінах пасля Напалеонаўскіх войнаў былі адноўлены абсалютысцкія парадкі. Народ пазбавілі ўсялякага доступу да ўлады. У Францыі кароль дараваў сваім падданым канстытуцыю, але ўдзельнічаць у выбарах і абірацца ў парламент маглі толькі самыя заможныя колы грамадства. Бяспраў-

насць народных мас, імкненне ўрадаў захаваць феадальныя парадкі ў тых краінах, дзе яны яшчэ існавалі, выклікалі ў Еўропе ў першай палове XIX ст. тры этапы рэвалюцый.

**Рэвалюцыі ў Іспаніі, Партугаліі, Сардзінскім каралеўстве і Каралеўстве абедзвюх Сіцылій**

Успомніце, якія дзяржавы ўваходзілі ў склад Свяшчэннага саюза.

Першы з іх прыпаў на пачатак 1820-х гг. У гэты час рэвалюцыі адбыліся ў Іспаніі, Партугаліі і ў італьянскіх дзяржавах — Каралеўстве абедзвюх Сіцылій і Сардзінскім каралеўстве. На пачатковым этапе рэвалюцый у названых дзяржавах на змену абсалютным манархіям прыйшлі канстытуцыйныя, былі скліканы парламенты. Гэтыя пераўтварэнні ў ліберальным духу выклікалі надзвычай негатыўную рэакцыю дзяржаў *Свяшчэннага саюза*. На яго кангрэсах, што адбыліся напачатку 1820-х гг., было вырашана задушыць рэвалюцыі. У 1821 г. аўстрыйскія войскі задушылі рэвалюцыі ў італьянскіх дзяржавах, а французскія — у 1823 г. у Іспаніі. Усе пераўтварэнні, праведзеныя на пачатковым этапе рэвалюцый, былі ліквідаваныя.

**Антытурэцкае паўстанне ў Грэцыі**

У пачатку 1820-х гг. Еўропа сутыкнулася і з нацыянальным рухам. У 1821 г. выбухнула антытурэцкае паўстанне ў Грэцыі. У выніку працяглай узброенай барацьбы, якую падтрымалі Расія, Англія і Францыя, грэкі ў 1830 г. здабылі незалежнасць.

**3. Рэвалюцыі 1830–1830 гг.** Сярод рэвалюцый пачатку 1830-х гг. найбольш значная была *Ліпеньская рэвалюцыя* ў Францыі. Штуршком да яе вы-



Луі-Філіп Арлеанскі напачатку свайго праўлення атрымаў мянушку «кароль-грамадзянін», якая неўзабаве змянілася на «кароль-буржуа». Як вы лічыце, чаму французы яго так называлі?

*Луі-Філіп I.*
*Мастак Ф. К. Вінтэрхальтэр. 1841 г.*

ступіла імкненне караля *Карла X* ліквідаваць парламент і ўзмацніць сваю ўладу. Адказам парыжан было паўстанне. Карл X адмовіўся ад трона і эміграваў у Англію. Новым каралём Палата дэпутатаў абвясціла *Луі-Філіпа Арлеанскага*. Ён павінен быў правіць паводле запрашэння французскага народа, а не спадчыннага права. Ліпеньская рэвалюцыя 1830 г. спыніла спробы аднавіць у Францыі абсалютысцкія парадкі. Улада перайшла ў рукі фінансавай буржуазіі.

**Рэвалюцыя ў Бельгіі**

У жніўні 1830 г. пачалася рэвалюцыя ў Бельгіі, якая згодна з рашэннем Венскага кангрэса з'яўлялася часткай Нідэрландскага каралеўства. Утварылася незалежная бельгійская дзяржава ў форме канстытуцыйнай манархіі. Паўстанні, накіраваныя супраць абсалютызму і аўстрыйскага панавання, успыхнулі ў невялікіх дзяржавах Цэнтральнай Італіі. Але аўстрыйскія войскі лёгка іх задушылі.

**Перадумовы рэвалюцый 1848–1849 гг.**

**4. Рэвалюцыі 1848–1849 гг.** Непасрэдным штуршком да рэвалюцый выступіў эканамічны крызіс 1846–1847 гг. Ён значна пагоршыў становішча не толькі рабочых, але і буржуазіі. Яна лічыла, што для абароны сваіх інтарэсаў неабходна атрымаць доступ да ўлады праз стварэнне або далейшае развіццё канстытуцыйнай парламенцкай сістэмы кіравання дзяржавай. Таму падчас рэвалюцый вырашаліся перш за ўсё задачы палітычнай перабудовы грамадства.

Напалеона III французскі народ называў «маленькі пляменнік вялікага дзядзькі». Чаму ён атрымаў такую мянушку? Хто яго «вялікі дзядзька»?



*Напалеон III. Мастак І. Фландрэн. 1861 г.*

### Рэвалюцыйныя падзеі ў Францыі

У Францыі ў выніку паўстання ў канцы лютага 1848 г. была ўсталяваная *Другая рэспубліка* (1848–1852 гг.) і ўведзена агульнае выбарчае права для мужчын. Аднак у выніку дзяржаўнага перавароту, ажыццёўленага прэзідэнтам *Луі Банапартам*, рэспубліка ў Францыі пала. Краіна вярнулася да канстытуцыйнай манархіі (Другой імперыі 1852–1870 гг.) на чале з імператарам *Напалеонам III*.

### Барацьба з абсалютызмам

У Аўстрыйскай імперыі, германскіх і італьянскіх дзяржавах рэвалюцыі ўступілі ў барацьбу супраць абсалютысцкіх рэжымаў. Частковы поспех быў дасягнуты ў Аўстрыі і Прусіі, у якіх манархі даравалі сваім падданым вельмі памяркоўныя канстытуцыі, якія нязначна абмежавалі іх уладу.

### Нацыянальнае пытанне

**Нацыянальны рух** — грамадскі рух, які ставіць за мэту вызваленне той ці іншай нацыянальнасці ад іншаземнага панавання або палітычнае аб'яднанне раздробленай нацыі ў адну дзяржаву.

Для шэрагу краін падчас рэвалюцый важнае было нацыянальнае пытанне. Народы Аўстрыйскай імперыі здабывалі незалежнасць. Найбольш моцнай была венгерская нацыянальная рэвалюцыя, на значным уздыме знаходзіўся **нацыянальны рух** у Чэхіі. Гэтыя выступленні атрымалі паражэнне, і Аўстрыйская імперыя захавала сваю цэласнасць. Нямецкі і італьянскі народы спрабавалі вырашыць задачу стварэння адзіных нацыянальных дзяржаў, але гэтая спроба скончылася няўдала.

### Асаблівасць рэвалюцый 1848–1849 гг.

Асаблівасцю рэвалюцый 1848–1849 гг. было тое, што ў іх значнай сілай выступілі пралетарыят і сацыялісты як палітычная плынь. Гэта паўплывала на пазіцыю буржуазных лібералаў. Яны негатыўна паставіліся да крайніх патрабаванняў сацыялістаў і прапанавалі ўмераную праграму пераўтварэнняў.

### Значэнне рэвалюцый 1848–1849 гг.

Агулам рэвалюцыі 1848–1849 гг. пацярпелі паражэнне. Аднак яны зрабілі ўнёсак у станаўленне новага дэмакратычнага грамадства і ліквідацыю феадальных перажыткаў. Вынікі рэвалюцый 1848–1849 гг. сведчылі пра складанасць і супярэчлівасць працэсу мадэрнізацыі, звязанага з укараненнем буржуазнага ладу.

**5. Уплыў рэвалюцыйных падзей у Еўропе на грамадскі рух у Расійскай імперыі і беларускіх губернях.** Рэвалюцыйныя падзеі ў Еўропе ў першай палове XIX ст. знайшлі водгук у Расійскай імперыі і ў беларускіх губернях, што ўваходзілі ў яе склад. Пасля заканчэння Айчыннай вайны 1812 г. у расійскім грамадстве моцныя былі чаканні рэформаў. Незадаволенасць існуючымі парадкамі была характэрная для многіх афіцэраў, якія ўдзельнічалі ў замежных паходах рускай арміі ў 1813–1815 гг. Пад уражаннем ад убачанага ў Еўропе яны прыйшлі да пераканання пра неабходнасць перамен у Расіі. Новы імпульс росту імкнення да перамен у расійскім грамадстве далі еўрапейскія рэвалюцыі пачатку 1820-х гг. У іх вялікую ролю адыгралі тайныя рэвалюцыйныя таварыствы, актыўнымі ўдзельнікамі якіх былі вайскоўцы. У Расіі афіцэры таксама пачалі ствараць тайныя таварыствы. Удзельнікаў гэтага руху пасля няўдалага выступу ў снежні 1825 г. пачалі называць дзекабрыстамі. Дзейнасць дзекабрыстаў ахоплівала і беларускія губерні Расійскай імперыі. У Літоўскім асобным корпусе, што дыслакаваўся ў раёне Беластока, было створана *Таварыства ваенных сяброў* на чале з **Міхаілам Рукевічам**. Спроба Таварыства ў снежні 1825 г. узняць паўстанне скончылася няўдачай. Асаблівасць дзекабрысцкага руху ў беларускіх губернях палягала ў тым, што ён усталяваў сувязі з польскім нацыянальным рухам.

Дзейнасць дзекабрыстаў

Жывы водгук у расійскім грамадстве знайшла Грэчаская нацыянальная рэвалюцыя, якая пачалася ў 1821 г. Пад ціскам грамадскай думкі Аляксандр I вымушаны быў змяніць сваю першапачатковую нейтральную пазіцыю, і Расія пачала падтрымліваць барацьбу грэкаў за незалежнасць. Перамога Ліпеньскай рэвалюцыі 1830 г. у Францыі, паспяховы пачатак Бельгійскай рэвалюцыі падштурхнулі польскіх шляхецкіх рэвалюцыянераў

Уплыў рэвалюцыйных падзей 1820–1830-х гг.

на адкрытае ўзброенае выступленне за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Удзельнікі паўстання разлічвалі на дапамогу рэвалюцыйнай Францыі і Англіі з яе ліберальнай палітычнай сістэмай. Аднак заходнія дзяржавы ніякай значнай падтрымкі паўстанцам не аказалі.

Уплыў рэвалюцыйных падзей 1830–1840-х гг.

У 1830–1840-я гг. з Заходняй Еўропы ў Расію пранікаюць ліберальныя ідэі. Іх прыхільнікі выступалі за правядзенне рэформаў, якія змянілі б расійскае самадзяржаўе, лічылі неабходным адмяніць прыгоннае права. У 1840-я гг. пад уплывам працэсаў, што адбываліся ў Еўропе, у грамадскім жыцці Расіі сфарміравалася рэвалюцыйна-дэмакратычная плынь. Яе прадстаўнікі абгрунтоўвалі неабходнасць ажыццяўлення пераўтварэнняў у Расіі рэвалюцыйным шляхам. Прыкладам рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў беларускіх губернях з'явілася дзейнасць *«Дэмакратычнага таварыства»*, створанага **Францам Савічам**.

Уплыў рэвалюцыйных падзей 1848–1849 гг.

Еўрапейскія рэвалюцыі 1848–1849 гг. выклікалі занепакоенасць царскага ўрада адносна стабільнасці сітуацыі ў заходніх губернях імперыі, у тым ліку і беларускіх. Каб не дапусціць тут рэвалюцыйных выступленняў, у Беларусь быў накіраваны дадатковы армейскі корпус. Генерал-губернатарам загадвалася зрабіць «усе неабходныя для захавання грамадскай бяспекі захады» на выпадак выступленняў шляхты супраць урада. Гэтыя дзеянні ўлад дазволілі прадухіліць усякія хваляванні ў беларускіх губернях.

Аб'яднанне Італіі. Аб'яднанне Германіі

**6. Узнікненне новых нацыянальных дзяржаў у Еўропе і Лацінскай Амерыцы.** Напачатку XIX ст. Італія была падзелена на некалькі невялікіх дзяржаў, частка італьянскіх зямель уваходзіла ў склад Аўстрыйскай імперыі. Рух за аб'яднанне Італіі ў адну дзяржаву ахоплівае перыяд з 1820 да 1871 г. Рухавіком гэтага працэсу была ідэя вя-

лікай італьянскай нацыі і барацьба супраць іншаземнага панавання. У руху шчыльна перапляталіся рэспубліканскі і манархічны кірункі. Галоўнымі постацямі, што ўвасаблялі гэтыя кірункі, былі *Джузэпэ Мадзіні*, *Джузэпэ Гарыбальдзі* (выступалі за стварэнне рэспублікі) і выбітны дзяржаўны дзеяч *Каміла Бенса Кавур* (прыхільнік манархічнай формы праўлення). Аб'яднанне Італіі завяршылася ў **1871 г.**, калі Папская вобласць была далучана да Італіі, а Рым зрабіўся сталіцай італьянскай дзяржавы. Аб'яднаная Італія была манархічнай дзяржавай.



Дж. Мадзіні



Дж. Гарыбальдзі

Аб'яднанне Германіі, як і Італіі, расцягнулася на некалькі дзесяцігоддзяў. У аснове аб'яднаўчага працэсу ляжала ідэя культурнай еднасці ўсіх немцаў незалежна ад дзяржаўнай прыналежнасці. Вялікі ўнёсак у распрацоўку ідэі адзінства нямецкай нацыі зрабілі прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі — філосафы, паэты, пісьменнікі. На заключным этапе аб'яднанне мэтаскіравана ажыццяўлялася вакол каралеўства Прусія. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыграў **Ота фон Бісмарк**, які ўзначаліў прускі ўрад у 1862 г. Ён заклікаў да аб'яднання нямецкіх зямель «жалезам і кроўю», бо лічыў, што вырашыць «германскае пытанне» немагчыма без актыўнай знешняй палітыкі і ўжывання сілы.



К. Б. Кавур

Пасля серыі паспяховых войнаў Прусіі супраць Даніі, Аўстрыйскай імперыі і Францыі ў **студзені 1871 г.** была абвешчана федэратыўная дзяржава Германская імперыя. Новая дзяржава складалася з некалькіх дзясяткаў дзяржаў з нямецкім насельніцтвам. Імператарам зрабіўся кароль Прусіі **Вільгельм I**, а канцлерам — Ота фон Бісмарк. Стварэнне Германскай імперыі змяніла суадносіны сіл у Еўропе і выступіла адной з прычын пачатку Першай сусветнай вайны.



О. фон Бісмарк



Цырымонія абвяшчэння Вільгельма I германскім імператарам адбылася 18 студзеня 1871 г. у Версалі, рэзідэнцыі французскіх каралёў.

*Як вы лічыце, чаму стварэнне Германскай імперыі абвяшчалася на тэрыторыі Францыі? З якімі падзеямі гэта звязана?*

У 70-я гг. XIX ст. актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух на Балканскім паўвостраве, значная частка якога ў той час знаходзілася пад уладай туркаў. Барацьба балканскіх народаў супраць Асманскай імперыі была падтрымана Расійскай імперыяй. Руска-турэцкая вайна (1877–1878 гг.) мела станоўчае значэнне для балканскіх народаў. Яе найважнейшым вынікам стала вызваленне Балгарыі: паводле Берлінскай дамовы 1878 г. ствараЛася фактычна самастойнае Балгарскае княства. Турцыя прызнавала поўную незалежнасць Румыніі, Чарнагорыі і Сербіі. Разам з тым пад уладай Турцыі засталіся вобласці са шматлікім нетурэцкім насельніцтвам (Паўднёвая Балгарыя, Македонія, Албанія, Фесалія, Эгейскія астравы). Балканскія краіны і пасля свайго вызвалення заставаліся арэнай спаборніцтва буйны́х еўрапейскіх дзяржаў.

### Вайна за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы

У 1810–1826 гг. праходзіла Вайна за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы. Актыўны ўдзел у вайне бралі *крэолы* (нашчадкі першых партугальскіх і іспанскіх перасяленцаў у Лацінскай Амерыцы). Галоўную ролю ў вызваленчай барацьбе адыгралі рэвалюцыйныя арміі. Найбольш значная з іх дзейнічала пад камандаваннем **Сімона Балівара**. Замест

іспанскіх калоній былі абвешчаны незалежныя дзяржавы: Мексіка, Вялікая Калумбія, што ўключала Новую Гранаду, Венесуэлу і Кіта, Аргенціна, Перу, Чылі і інш. У іх усталявалася рэспубліканская форма праўлення.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Ад 1825 г. тэрыторыя Верхняга Перу ў гонар С. Балівара пачала называцца Балівіяй. Яго імя таксама носяць: дэпартамент у Калумбіі, штат на паўднёвым усходзе Венесуэлы (з аднайменнай сталіцай), правінцыя ў Эквадоры, група нафтавых радовішчаў у Венесуэле, а таксама найвышэйшая горная вяршыня гэтай дзяржавы.

1. З чым звязаная такая папулярнасць С. Балівара ў Лацінскай Амерыцы?
2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, што яшчэ названа ў гонар гэтага чалавека.



*С. Балівар. Мастак А. Мікелена. 1895 г.*

### Незалежнасць Бразіліі

Шлях да незалежнасці партугальскай Бразіліі не суправаджаўся вызваленчай вайной. У 1822 г. яна аддзялілася ад Партугаліі мірным шляхам. Прынц *Педра*, што належаў да партугальскага каралеўскага дома, быў абвешчаны імператарам. У Бразіліі да 1889 г. існавала манархічная форма праўлення.

У новых дзяржавах адмянялася саслоўная і расавая няроўнасць, аднак у большасці з іх рабства захавалася. Улада засяродзілася ў руках зямельнай арыстакратыі. Вялікую ролю ў палітычным жыцці адыгрывалі вайскоўцы.




*Лацінская Амерыка ў першай палове XIX ст.*

Якія новыя дзяржавы ўзніклі ў Лацінскай Амерыцы ў выніку Вайны за незалежнасць? Выкарыстоўваючы сучасную палітычную карту свету, вызначце, якія з гэтых дзяржаў існуюць у наш час.

**7. Змяненне геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе.** Крах імперыі Напалеона I і рашэнні, прынятыя на Венскім кангрэсе, змянілі геапалітычную сітуацыю ў Еўропе.

### ЗМЯНЕННЕ ГЕАПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў ЕЎРОПЕ ЗГОДНА З РАШЭННЯМІ ВЕНСКАГА КАНГРЭСА

| | |
|---|---|
| **Францыя** | вярнулася да межаў, якія яна мела ў 1792 г. на пачатак Рэвалюцыйных войнаў |
| **Вялікабрытанія** | умацавала пазіцыі вядучай марской, каланіяльнай і гандлёвай дзяржавы |
| **Аўстрыя** | атрымала тэрыторыі на поўначы Італіі, у тым ліку Венецыю і Мілан |
| **Прусія** | далучыла землі на Рэйне і частку Саксоніі |
| **Расія** | замацавала за сабой Фінляндыю, Бесарабію, большую частку польскіх зямель, на якіх было створана аўтаномнае Царства Польскае |

Вызначце, якія дзяржавы істотна ўмацавалі свае міжнародныя пазіцыі і павялічылі свае тэрыторыі. Чаму рашэнні Венскага кангрэса былі прынятыя на карысць гэтых дзяржаў?

Каб ахоўваць усталяваны міжнародны парадак, які атрымаў назву **Венская сістэма міжнародных адносін**, Расія, Аўстрыя і Прусія стварылі ў 1815 г. Свяшчэнны саюз. Стваральнікі Венскай сістэмы лічылі, што найбольшую пагрозу для яе існавання нясуць рэвалюцыі. Таму Свяшчэнны саюз засяродзіў свае намаганні на барацьбе з імі. Яму ўдалося напачатку 1820-х гг. задушыць рэвалюцыйныя выступленні ў Іспаніі, італьянскіх дзяржавах. Але ўжо рэвалюцыі пачатку 1830-х гг. унеслі істотныя змены ў геапалітычную сітуацыю ў Еўропе. У Францыі

**Венская сістэма міжнародных адносін** — сістэма еўрапейскага светапарадку, якая сфарміравалася пасля Напалеонаўскіх войнаў на аснове Венскага кангрэса 1814–1815 гг.

Успомніце, на якіх прынцыпах грунтавалася Венская сістэма міжнародных адносін.

ў выніку Ліпеньскай рэвалюцыі 1830 г. была зрынутая дынастыя Бурбонаў і на трон узышоў Луі-Філіп Арлеанскі. Ён быў манархам, што атрымаў трон у выніку рэвалюцыі воляй нацыі. Тым самым быў парушаны адзін з асноўных для Венскай сістэмы прынцып легітымізму (законнасці ўлады манарха ў сілу спадчынных правоў). Свяшчэнны саюз не мог гэтаму процідзейнічаць. Не здолеў ён задушыць і Бельгійскую рэвалюцыю, у выніку якой Бельгія аддзялілася ад Нідэрландскага каралеўства і зрабілася незалежнай дзяржавай. У 1830 г. была афіцыйна прызнаная незалежнай дзяржавай Грэцыя, якая вызвалілася з-пад улады Асманскай імперыі.

Еўрапейскія рэвалюцыі 1848–1849 гг. былі яшчэ адным выклікам Венскай сістэме. У Францыі ўсталявалася рэспубліка, а пасля ўлада перайшла да Луі Банапарта. Вяртанне да ўлады ў Францыі дынастыі Банапартаў выклікала ў Еўропе занепакоенасць, што гэтая дзяржава разгорне барацьбу за адмену дамоў 1814–1815 гг. Аднак у цэлым Венская сістэма здолела пераадолець рэвалюцыйныя ўзрушэнні першай паловы XIX ст. Захаваліся такія яе найважнейшыя элементы, як раўнавага сіл паміж вялікімі дзяржавамі, раздробленасць Германіі і Італіі.

*Нацыяналізм, які зрабіўся ў першай палове XIX ст. адной з вядучых ідэалогій у Еўропе, паспрыяў фарміраванню новых і ўмацаванню тых нацыянальных дзяржаў, якія ўжо склаліся. Ён спарадзіў нацыянальныя рухі сярод прыгнечаных народаў, стварыў пагрозу для існавання шматнацыянальных імперый. Аб'яднанне Італіі і Германіі завяршыла працэс складвання нацыянальных дзяржаў у Заходняй Еўропе. Важнай падзеяй была Вайна за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы, якая прывяла да стварэння новых самастойных дзяржаў.*

| **калі ў свеце...** | **на тэрыторыі Беларусі...** |
| --- | --- |
| 1830 г. — Ліпеньская рэвалюцыя ў Францыі | 1830–1831 гг. — паўстанне ў Польшчы, Літве і Беларусі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія фактары спрыялі росту нацыянальнай самасвядомасці народаў Еўропы? У чым заключаецца сутнасць ідэалогіі нацыяналізму? Якім чынам ідэалогія нацыяналізму паспрыяла ўтварэнню новых дзяржаў?
2. Якія задачы стаялі перад нацыянальнымі рухамі ў Германіі і Італіі? Чым яны адрозніваліся ад нацыянальных рухаў у Аўстрыйскай імперыі?
3. На аснове тэксту параграфа складзіце кароткую гістарычную даведку «Рэвалюцыі першай паловы XIX ст. у Еўропе», адлюструйце ў ёй этапы, мэты і задачы, удзельнікаў, наступствы рэвалюцый. Вызначце характар рэвалюцый першай паловы XIX ст. у Еўропе. Як вы лічыце, чаму адны рэвалюцыі заканчваліся перамогай, а іншыя — паражэннем? Якія фактары гэта абумоўлівалі?
4. Назавіце кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху ў Еўропе і Лацінскай Амерыцы. Хто з іх зрабіўся нацыянальным героем? Як бы вы вызначылі, хто такі нацыянальны герой? Прывядзіце свае прыклады.
5. У другой палове XVI ст. рэвалюцыя адбылася ў Нідэрландах, у XVII ст. — у Англіі, у XVIII ст. — у Францыі. У першай палове XIX ст. рэвалюцыі прайшлі практычна па ўсіх краінах Еўропы. Ці ёсць тут гістарычная заканамернасць? Чаму менавіта ў гэты перыяд рэвалюцыя ператварылася ў галоўны інструмент вырашэння сацыяльных супярэчнасцей?
6. Ахарактарызуйце дзейнасць Свяшчэннага саюза. Ці можна сказаць, што гэтая арганізацыя здолела задушыць рэвалюцыйны рух у Еўропе?